

**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**30 КАНАЛАЎ**



**Напярэдадні свята 8 Сакавіка мы сабралі ў рэдакцыі «Звязды» пяць прыгожых і, не пабаімся гэтага слова, шчаслівых жанчын. Каб пагаварыць пра вечнае — каханне, жаноцкасць і... мужчын.**

СТАР. 7



**Гераіня гэтай публікацыі вырасла ў звычайнай бабруйскай сям'і: маці працуе ў краме, а тата займаецца грузаперавозкамі, але неўзабаве Наталля стала... ваенным пілотам!**

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 САКАВІКА 2013 г. ЧАЦВЕР № 44 (27409) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Фота БЕЛТА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «У АСОБЕ УГА ЧАВЕСА МЫ СТРАЦІЛІ ЛЕПШАГА СЯБРА, ЯКІ ГОРАЧА ЛЮБІЎ БЕЛАРУСЬ І ЗАЎСЁДЫ ПРАЦЯГВАЎ РУКУ ДАПАМОГІ»

**Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да грамадзян Беларусі і прадстаўнікоў міжнароднай грамадскасці ў сувязі са смерцю Прэзідэнта Балівaрыянскай Рэспублікі Венесуэла Уга Чавеса:**

«Нашы сэрцы разанула сумная вестка — пайшоў з жыцця блізкі, надзейны сябар, наш брат, Прэзідэнт Балівaрыянскай Рэспублікі Венесуэла Уга Чавес Фрыяс.

Мы, не стрымліваючы слёз, смуткуем разам з венесуэльскім народам, аплакваючы заўчасную смерць Уга Чавеса — аднаго з найвялікшых дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў сучаснасці, нязломнага героя, палымянага патрыёта і змагара за незалежнасць, выдатнага палітыка, мысліцеля і прамоўцы, яркага, моцнага і жыццелюбівага чалавека, усё жыццё якога было поўнасцю і без астатку прысвечана служэнню Айчыне.

Пад кіраўніцтвам Уга Чавеса, наследніка і прадаўжальніка свяшчэннай справы Сімона Балівара, Венесуэла скінула ненавіснае ярмо адсталасці і беднасці, вызвалілася ад палітычнага і эканамічнага прыгнёту іншаземных дзяржаў. Прэзідэнт Чавес моцнай, цвёрдай рукой упэўнена вёў родную краіну да свабоды і шчасця. Ён быў і, я ўпэўнены, назаўсёды застанецца для мільёнаў людзей сапраўдным бацькам венесуэльскай нацыі, абаронцам бедных, абяздоленых і прыгнечаных, светачам надзеі і апорай дэмакратыі на Паўднёва-Амерыканскім кантыненце.

У асобе Уга Чавеса мы страцілі блізкага чалавека і лепшага сябра, які горача любіў Беларусь і заўсёды працягваў нам руку дапамогі ў цяжкую хвіліну. Сумесная работа на карысць Беларусі і Венесуэлы, тыя цёплыя, чалавечыя адносіны, якія звязвалі нас усе гэтыя гады, назаўсёды застануцца аднымі з самых дарагіх успамінаў у маім жыцці.

Імя Прэзідэнта Балівaрыянскай Рэспублікі Венесуэла Уга Чавеса Фрыяса залатымі літарамі ўпісана ў скрыжалі сусветнай гісторыі, яго асоба і здзяйсненні цяпер належаць вечнасці.

Сёння, у гэты час болю і смутку, мы спачуваем родным і блізкім Уга Чавеса, усяму народу Венесуэлы і клянёмся памяццю яе вялікага лідара ўвасобіць нашы сумесныя задумы і планы ў жыццё, прадоўжыць палітыку дружбы і ўзаемадапамогі, зрабіць усё для далейшага ўмацавання і развіцця супрацоўніцтва на карысць абедзвюх краін.

Спачывай з мірам, наш сябар і брат Уга Чавес. Твая справа будзе жыць у стагоддзях!»

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Барыс БАТУРА, старшыня Мінаблвыканкама:**

***«Цяжка пераацаніць уклад жанчын у развіццё асноватворных кірункаў дзейнасці грамадства — ахова здароўя, асвета, культура, прадпрымальніцтва. Перадавыя пазіцыі ў многіх сектарах эканомікі ў значнай ступені заваяваны талентам і працавітасцю жанчын. Яны маюць моцны голас у парламенце і прымаюць актыўны ўдзел у вырашэнні найважнейшых дзяржаўных праблем. Варта адзначыць і такія зайздросныя якасці жанчын, як іх высокая адукаванасць, прафесіяналізм, мэтанакіраванасць, адказнасць, творчыя адносіны да справы. Жанчыны з'яўляюцца той жыватворнай крыніцай, з якой краіна чэрпае сілы для новых здзяйсненняў».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.03.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8640,00 | ■ |
| Еўра | 11280,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 282,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1063,38 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 4 ° |
| Віцебск | – 4° |
| Гомель | 0° |
| Гродна | + 2° |
| Магілёў | – 2° |
| Мінск | – 2° |

# БЕЛАРУСЬ СМУТКУЕ РАЗАМ З УСІМ СВЕТАМ

**Па даручэнні кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі ў Каракас для ўдзелу ў жалобных мерапрыемствах у сувязі са смерцю Прэзідэнта Балівaрыянскай Рэспублікі Венесуэла Уга Чавеса накіроўваецца афіцыйная дэлегацыя ў складзе кіраўніка спраў Прэзідэнта Беларусі, сустаршыні Беларуска-венесуэльскай камісіі высокага ўзроўню Віктара Шэймана і першага намесніка прэм'ер-міністра, сустаршыні Беларуска-венесуэльскай сумеснай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве Уладзіміра Сямашкі.**

Прэзідэнт Беларусі накіраваў асабістыя пасланні сям'і свайго блізкага сябра, яго брату, губернатару штата Барынас Адану Чавесу, віцэ-прэзідэнту Венесуэлы Нікаласу Мадура і старшыні Нацыянальнай асамблеі Дзіясдада Кабельё. Па даручэнні Аляксандра Лукашэнкі з самай раніцы 6 сакавіка на тры дні над будынкамі рэзідэнцыі Прэзідэнта Беларусі і іншых дзяржустаноў па ўсёй краіне прыспушчаны дзяржаўныя сцягі. Усім тэле- і радыёканалам рэкамендавана выключыць з эфіру забаўляльныя перадачы. Рэспубліка Беларусь далучылася да жалобных мерапрыемстваў, якія праходзяць у шэрагу краін свету ў сувязі са смерцю венесуэльскага лідара.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ВЕНЕСУЭЛЬСКІ НАРОД НЕСУЦЕШНЫ Ў СУВЯЗІ СА СМЕРЦЮ ЛІДАРА КРАІНЫ



Венесуэльскі народ смуткуе ў сувязі са смерцю лідара краіны Уга Чавеса. Тысячы людзей збіраюцца каля ваеннага шпіталя Каракаса, каб развітацца з прэзідэнтам, перадаюць інфармагенцтвы. Развітанне з лідарам Балівaрыянскай Рэспублікі Венесуэла праходзіць тры дні: у сераду, чацвер і пятніцу. Дзяржаўная цырымонія з удзелам замежных лідараў у сувязі са смерцю Чавеса адбудзецца ў пятніцу. Урад ужо абвясціў у краіне сямідзённую жалобу. Міністр замежных спраў рэспублікі Эліяс Хаўа заклікаў суграмадзян падтрымліваць мір, каб такім чынам аддаць даніну лідару краіны. Віцэ-прэзідэнт Венесуэлы Нікалас Мадура падзякаваў кіраўнікам дзяржаў і ўрадаў, якія выказалі спачуванні ў сувязі са смерцю Уга Чавеса. Заслугі памерлага прэзідэнта Венесуэлы адзначылі Генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун, а таксама лідары шэрагу краін. З сыходам з жыцця Уга Чавеса Лацінская Амерыка губляе асноўную рухаючую сілу рэгіянальных інтэграцыйных працэсаў, заявіў Пан Гі Мун. У афіцыйнай заяве з нагоды смерці прэзідэнта Венесуэлы ён падкрэсліў, што той выступаў за інтарэсы самых неабароненых слаёў насельніцтва сваёй краіны.

Улады лацінаамерыканскіх краін — Аргенціны, Кубы, Балівіі і Эквадора абвясцілі трохдзённую жалобу ў сувязі са смерцю Чавеса.

### У ОРГАНАХ ЗАКАНАДАЎЧАЙ УЛАДЫ ПЯТАЯ ЧАСТКА — ЖАНЧЫНЫ

У вышэйшых органах заканадаўчай улады ў 2012 годзе жанчыны займалі 20,3% месца.

У 2011 годзе гэтая лічба была на адзін працэнт ніжэй, паведамляе Цэнтр навін ААН.

Такім чынам, міжнародная супольнасць рухаецца наперад па шляху да гендарнай роўнасці ў парламентах. Часткова гэты прагрэс з'яўляецца вынікам увядзення ў многіх краінах квот на колькасць месцаў для жанчын сярод дэпутатаў.

Міжпарламенцкі саюз прадставіў справаздачу, якая змяшчае статыстыку па колькасці жанчын у парламентах у 2012 годзе. Яго выпуск прымеркаваны да 57-й сесіі Камісіі ААН па становішчы жанчын, якая праходзіць у штаб-кватэры ААН у Нью-Ёрку, а таксама да Міжнароднага жаночага дня.

У мінулым годзе парламенцкія выбары былі праведзены ў 48 краінах. У 22 з іх выкарыстоўваліся квоты, якія прывялі да таго, што колькасць жанчын сярод заканадаўцаў павялічылася да 22-24%. Там, дзе не ўжывалася сістэма квот, жанчыны атрымалі на выбарах у парламенты не больш за 12% месцаў.

### УЛАДЗІМІР ФЛЕЙШАР ЗМЕНІЦЬ ВАЛЕРЫЯ ЗАЛАТУХІНА Ў ТЭАТРЫ НА ТАГАНЦЫ

Пасля шпіталізацыі мастацкага кіраўніка Валерыя Залатухіна новым дырэктарам Тэатра на Таганцы стаў заслужаны дзеяч культуры Расіі Уладзімір Флейшар, паведамляюць інфармагенцтвы. Валерый Залатухін напярэдадні быў шпіталізаваны ў рэанімацыю Інстытута рэнтгенарадыялогіі Масквы. Яго стан ацэньваецца як цяжкі. За дзень да шпіталізацыі Залатухін падаў заяву аб сыходзе з пасады кіраўніка тэатра на Таганцы з-за пагаршэння здароўя. Раней Флейшар узначальваў Цэнтр імя Меерхольда.

ISSN 1990 - 763X





**Кніга спачуванняў у сувязі са смерцю Прэзідэнта Балівaрыянскай Рэспублікі Венесуэла Уга Чавеса адкрыта ў венесуэльскім пасольстве ў Мінску. Да будынка пасольства Венесуэлы ўчора ішлі беларусы, многія з кветкамі і свечкамі.**

Фота БЕЛТА.

# НА СМЕРЦЬ ГЕРОЯ

**Смерць Прэзідэнта Балівaрыянскай Рэспублікі Венесуэла Уга Рафаэля Чавеса Фрыаса, безумоўна, узрушыла ўсіх. Два доўгія гады мужнай барацьбы з ракам закончыліся сумным фіналам. Уга Чавес, чалавек з магутнай энергетыкай і харызмай, змог перамагчы ўсіх ворагаў сваёй горача любімай ім краіны, як знешніх, так і ўнутраных, але паў ахвярай страшнай хваробы.**

Чым запомняцца венесуэльцам доўгія гады кіравання Чавеса? Безумоўна, тым, што гэта быў самы адкрыты да стасункаў з народам лацінаамерыканскі прэзідэнт. Штотыдзень многія гадзіны ён прысвячаў зносінам з выбаршчыкамі. Пры гэтым заўсёды выказваўся прама і бескампрамісна. Шчырасць і прамата прэзідэнта імпанавалі венесуэльцам — Чавес расказваў у адкрытым эфіры аб тых праблемах, якія турбавалі і простых грамадзян.

Вядома, вялікая ўвага ім надавалася барацьбе з беднасцю. Мільёны бедных у краіне, якая з'яўляецца ўладальніцай велізарных запасаў нафты, з'явіліся наступствам іншай праблемы — засілля алігархаў і прагных замежных карпарацый у эканоміцы. Так было да Чавеса, і ўсе гады ва ўладзе яму прыходзілася ваяваць і з тымі, і з другімі. І калі першыя гады ва ўладзе ён стараўся выкарыстоўваць мяккія метады барацьбы па пераразмеркаванні багацця ад алігархаў і замежнікаў да радавых венесуэльцаў, каб не выклікаць дадатковых праблем у эканоміцы, то, калі ён пераканаўся, што гэта расцэньваецца апанентамі як слабасць, метады прыйшлося памяняць.

Асаблівa паказальнай стала спроба перавароту ў 2002 годзе, спансіраванага мясцовымі алігархамі і замежнымі спецслужбамі, калі жыццё і свабода Чавеса былі выратаваны мільёнамі простых венесуэльцаў, якія запатрабавалі неадкладна вызваліць схопленага змоўшчыкамі прэзідэнта. Безумоўна, пасля такога правакацыйнага акта ў дачыненнях да суверэннай Венесуэлы Чавесу прыйшлося дзейнічаць з ворагамі сваёй краіны зусім інакш. І чаша вагаў схілілася на яго карысць.

Удалося ў выніку дабіцца неістотных вынікаў і ў барацьбе з беднасцю. Калі грошы ад эксплуатацыі рэсурсаў краіны перасталі выводзіцца на замежныя рахункі абмежаванага кола асоб, а былі накіраваны на патрэбы радавых венесуэльцаў, у выніку чаго беднасць удалося скараціць больш чым у два разы. Пачалі працаваць маштабныя праграмы па рэалізацыі прадуктаў харчавання маламаёмным па цэнах, датаваных дзяржавай. Запушчаны ў рэалізацыю грандыёзныя праграмы па вырашэнні складанасцяў з жыллём, закліканыя паступова вырашыць праблему з засіллем фавел, самастойна пабудаваных беднякамі хацін, раёнаў антысанітарыі і злачыннасці, жахлівай спадчыны ранейшых алігархічных рэжымаў.

Грандыёзны прарыў быў ажыццёўлены ў медыцыне. Дзясяткі тысяч кубінскіх урачоў (а кубінская медыцына па праве лічыцца лепшай у Лацінскай Амерыцы) прыбылі для пастаяннай працы з абяздоленым насельніцтвам Венесуэлы. Рэзка павялічылася колькасць школ, а колькасць студэнтаў ва ўніверсітэтах падвоілася. Адукацыя, як сярэдняя, так і вышэйшая, упершыню аказалася лёгкадаступнай шырокім пластам грамадзян.

Вядома, за ўсё гэта — адабраныя ў алігархаў і замежнікаў грошы на сацыяльныя праграмы для мільёнаў беднякоў, бескампрамісныя выказванні ў адрас моцных свету ўсяго, што вяршылі несправядлівыя справы, — Чавесу прыйшлося расплачвацца сваім здароўем. Пастаянныя абразы ў адрас прэзідэнта сыпаліся як гарох з мяшка як ад мясцовых, так і ад уплывовых замежных «лібералаў». Небяспечныя ідэі клопату аб простых грамадзянах, замест арыентацыі эканомікі на папаўненне банкаўскіх рахункаў нешматлікай эліты і яе замежных сяброў, здаваліся ім крамольнай заразай, з якой неабходна змагацца гарачым жалезам. Ідэі Чавеса сапраўды аказаліся прывабнымі для ўсяго лацінаамерыканскага кантынента. Прыхільнікі і ідэйныя паслядоўнікі Чавеса сталі масава прыходзіць да ўлады ў іншых лацінаамерыканскіх краінах, што выклікала сапраўдную паніку ў ЗША.

Уга Чавес непазбежна стане новым героем Лацінскай Амерыкі, Сімонам Балівaрам XXI стагоддзя. Сімон Балівар прынёс свабоду ад іспанцаў, Чавес натхніў лацінаамерыканцаў на барацьбу з алігархамі і замежнымі ўрадамі, якія неміласэрна эксплуатуюць багатыя прыродныя рэсурсы краіны кантынента праз сваіх стаўленікаў. Яго будуць ідэалізаваць, ім будуць захапляцца. Яго ідэі будуць натхняць сотні мільёнаў лацінаамерыканцаў і сумленных палітычных лідараў і праз дзесяцігоддзі, і праз стагоддзі. Непазбежна будуць спрэчкі, ці можна было рэалізоўваць больш эфектыўныя сацыяльныя або эканамічныя рэформы ў Венесуэле. Але галоўным застанецца тое, што менавіта ён зрабіў першы, найважнейшы крок — сумленна паказаў венесуэльцам усе наяўныя праблемы, паставіў задачы па іх вырашэнні, якія да яго ніхто не ставіў, і з усёй адвагай і энергіяй змагаўся за іх рэалізацыю, каб інтарэсы радавых венесуэльцаў былі не пустым словам, а асновай асноў венесуэльскай палітыкі і эканомікі.

Венесуэлу, безумоўна, чакаюць няпростыя часы. Краіна стала самым буйным нафтавым цэнтрам у свеце, і амерыканцы, вядома ж, кінуць усе магчымыя сілы для пастаноўкі на чале ўлады праамерыканскага прэзідэнта для кантролю Венесуэлы і эксплуатацыі яе багаццяў. Адзінай сацыялістычнай партыі Венесуэлы неабходна аб'яднацца ў гадзіну цяжкай страты і аказацца годным пераемнікам ідэй Чавеса і яго стылю бескампраміснай барацьбы за ідэалы свайго народа.

**Сяргей КІЗІМА, загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі ўпраўлення пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар палітычных навук.**



Фота БЕЛТА.



# ВЯНЕЦ ВЯНЦА,

## або Ці лёгка быць жанчынай?


Дзіяна БАЛЫКА


Рыта МІКУШАВА


Ірына НАРБЕКАВА


Вераніка СЯРДЗЮК


Святлана ШЫЛАВА

**Напярэдадні свята 8 Сакавіка мы сабралі ў рэдакцыі «Звязды» пяць прыгожых і, не пабаімся гэтага слова, шчаслівых жанчын. Каб пагаварыць пра вечнае — каханне, жаноцкасць і... мужчын. Мы склалі план размовы, але потым паспяхова пра яго забыліся, бо сама сустрэча, думкі, усмешкі, святло, якое лілося з жаночых вачэй і, вядома, эмоцыі прадыктавалі свае павароты ў размове. На жаль, далёка не ўсё ўвайшло ў гэты тэкст, але, спадзяёмся, задавальненне ад размовы нам удалося захаваць. Гасцявалі ў «Звяздзе» пісьменнік і псіхолаг Дзіяна БАЛЫКА, партнёр адвакацкага бюро «Правы і сямейная медыяцыя» Рыта МІКУШАВА, актрыса Тэатра-студыі кінаакцёра Ірына НАРБЕКАВА, кіраўнік Цэнтра падтрымкі сям'і і мацярынства «Матуля» Вераніка СЯРДЗЮК і намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы Святлана ШЫЛАВА. Гасцей прымалі журналісты Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА і Святлана БАРЫСЕНКА.**

### Шанцаванне або пакаранне?

**Вольга Мядзведзева:** Шмат гадоў таму ў мяне адбылася памятная размова з кінарэжысёрам Аляксандрам Сакуравым. Мы размаўлялі пра яго дэбютны дакументальны фільм «Марыя», зняты з 9-гадовым перапынкам у 1978-м і 1988-м гадах. Гэта аповед пра перадавую калгасніцу Марыю Вайнову, жанчыну з пакалення, на якім «літаральна аралі зямлю». Фільм — абвінавачанне: нельга прыносіць жаноцкасць у ахвяру чаго б там ні было, высокай ідэі, аднаўленню народнай гаспадаркі, поспехам у вытворчасці... Сакураў тады сказаў: жанчынам значна лягчэй на гэтым свеце, бо іх прадвызначэнне вядомае. Мужчыны ж увесь час шукаюць, увесь час сумняваюцца... Яны як згубленыя дзеці. І вось усё сваё жыццё я перыядычна згадваю гэтыя словы Сакурава. Калі сыходзіла ў дэкрэтны адпачынак, калі разрывалася паміж працай і хатнімі абавязкамі, калі здавалася, што не паспяваю ні тут, ні там... А як у вас? Вы згодны, што нарадзіцца жанчынай — шанцаванне? Бо ўсё з ёй быццам бы зразумела...

**Святлана ШЫЛАВА:** Я катэгарычна не згодна з тым, што адзінае прызначэнне жанчыны — у нараджэнні дзяцей. Так можна было казаць у XV стагоддзі, самае позняе — у XIX-м. Але не ў наш час. Настолькі сучасная жанчына прасунутая ў жыцці, што яна паспявае ўсё: і нараджаць дзяцей, і кахаць мужчыну, і быць паспяховай на працы. І гэта залежыць толькі ад яе. Лягчэй быць паспяховай, калі побач ёсць годная палова — мужчына. Аднак я ведаю шмат жанчын, якія змаглі сябе рэалізаваць і без мужа. Яны таксама паспяваюць і ў побыце, і ў кар'еры. Гэта — моцныя жанчыны.

Калі жанчына жадае быць слабай, яна заўсёды знойдзе, на што паскардзіцца: няма грошай, няма футра, няма машыны... Але гэта — няправільна. У маім жыцці таксама былі розныя перыяды, былі вельмі складаныя. Калі я засталася адна з маленькім дзіцем і пісала дысертацыю... Жыццё загартоўвае: чым складаней, тым цікавей. У цішыні ды спакоі цяжка сябе рэалізаваць. Мне падабаецца, што маладыя жанчыны сёння імкнуцца быць матэрыяльна незалежнымі, што яны клапоцяцца пра сваю знешнасць, што яны больш патрабавальныя да сваіх партнёраў. Мне шкада толькі, што яны менш рамантычныя, чым мы.

> **Жанчына, колькі б у яе дзяцей ні было, будзе адчуваць сваё прызванне і будзе самарэалізоўвацца. Калі ў яе ёсць здольнасці, то яна знойдзе і магчымасці.**

**Рыта МІКУШАВА:** Жанчына сядзець дома не можа. Гэта факт, але факт і тое, што ў першую чаргу яна з'яўляецца элементам пэўнай сістэмы. У першую чаргу, сваёй сям'і, паколькі менавіта вакол яе збіраюцца дзеці, муж, бацькі... Шкада толькі, што інстытут сям'і страчвае нейкую сваю важную функцыю... Гэта можа быць па розных прычынах. У нейкі момант на гэта ўплывалі дзяржаўныя выплаты на дзяцей. Дадалася яшчэ страта мужчынамі жадання несці адказнасць за жанчыну і дзіця. На Усходзе мужчына не проста так мае некалькі жонак. Ён пра кожную з іх клапоціцца. Дарэчы, нашы жанчыны часам не скасоўваюць шлюб толькі таму, што цудоўна ведаюць: мужчына пакіне іх з пустымі кішэнямі.

Наша прыватнае адвакацкае бюро «Правы і сямейная медыяцыя» спецыялізуецца якраз на пытаннях, звязаных з сям'ёй. Гэта і скасаванне шлюбу, і ўдзел у выхаванні дзяцей, і падзел маёмасці... Але мы прапануем яшчэ і медыяцыю — гэта магчымасць людзям, якія знаходзяцца ў канфлікце, з дапамогай незалежнай асобы, а менавіта медыятара, дамовіцца паміж сабой, знайсці прымальны варыянт для ўсіх членаў сям'і. Па вялікім рахунку, можна дапусціць, што гісторыя канкрэтных мужчыны і жанчыны скончылася, але ж гісторыя бацькоў не заканчваецца ніколі.

**Вераніка СЯРДЗЮК:** У мяне чацвёра дзяцей. Чакаем з мужам нараджэння пятага. Але мне здаецца, што гэта вялікі міф — тое, што жанчына можа абмежавацца толькі домам. Гэты міф стварылі жанчыны, якія змагаюцца за свае правы. Як культуролаг, магу сказаць, што ніколі ў гісторыі маладая здаровая жанчына, калі нараджала дзяцей, не абмяжоўвалася домам. Сялянка працавала ў полі, купчыха займалася бізнесам свайго мужа, арыстакратка — дабрачыннасцю, баламі... Жанчыне ва ўсе часы дапамагала гадаваць дзіця старэйшае пакаленне — бабулі і дзядулі перадавалі вопыт, дапамагалі стварыць так званую дыяду з дзіцем.

Нам зараз стараюцца навязаць выбар: або «хатняя курыца», або «бізнэс-лэдзі». На самой справе гэта прыдуманая праблема. Жанчына, колькі б у яе дзяцей ні было, будзе адчуваць сваё прызванне і будзе самарэалізоўвацца. Калі ў яе ёсць здольнасці, то яна знойдзе і магчымасці.

Але з іншага боку, калі нараджаліся дзеці, усе чатыры разы для мяне паўставала пытанне: калі пачынаць абмяжоўваць дзіцячае права на мяне як на маці, на карміцельку, на сродак асваення свету, калі ўводзіць новых людзей у яго асяроддзе? Але самае галоўнае — гэта не толькі пытанне дзіцяці, але і пытанне мужа. Бо жанчына створана не толькі для дзяцей — яна ў першую чаргу створана для мужа.

Як веруючы чалавек, я свой светапогляд будую на Святым Пісанні, дзе сказана, што жанчына была створана пасля мужчыны — яшчэ больш цудоўнай, разумнай і вытанчанай, бо мужчына створаны з зямлі, а жанчына — з рабрыны! Калі мужчына — вянец тварэння, то жанчына — вянец вянца! Але яна была створана як памочніца. І як бы жанчына ні храбрылася, яна без мужчыны адчувае сябе непаўнацэннай. Ці так яна была створана — невядома. Бо так званы «праклён Евы», калі «ў пакутах будзеш нараджаць дзяцей, і да мужа будзе прыхільнасць твая» (Быц. 3, 16), адбыўся, калі жанчына з'ела забаронены плод, калі яна разбурыла парадак, які быў задуманы Творцам (а некаторыя лічаць, што гэта быў матрыярхат). Гэта асаблівае пакаранне — ніколі не адчуваць сябе цалкам шчаслівай без мужчыны і без адчування запатрабаванасці некаму.

**Ірына НАРБЕКАВА:** Я нядаўна перачытвала кнігу пра Эдыт Піяф, жыццё і творчасць якой мяне захапляюць... Разважала над тым, што галоўнае для жанчыны, а што — для мужчыны? Адказ, мне падаецца, адназначны: каханне! Жанчына можа рэалізавацца ў любой галіне. Але для гэтага ёй патрэбная... закаханасць. У мяне было два шлюбы з добрымі адносінамі. Я шчаслівая, што ў мяне былі гэтыя адносіны... У першым шлюбе я прыходзіла дадому пасля спектакля і купалася ў клопаце... Але праз 7 гадоў шлюб распаўся, і прычынай стала не пагаршэнне нашых адносін, а адсутнасць дзяцей. Я нарадзіла сваю дачку толькі ў другім шлюбе, у 36 гадоў. Шлюб таксама распаўся, на гэты раз з-за маіх творчых амбіцый і поспехаў... Але адносіны з гэтым чалавекам засталіся нармальнымі, і думаю, маё дзіця атрымала ад нас зерне любові, у якой яно ўвайшло ў гэты свет...

> **Праблема ў тым, што нашы мужчыны, яшчэ з заканчэння Другой сусветнай вайны, сталі выхоўвацца пераважна ў жаночых сем'ях, дзе ім маглі даць толькі жаночую мадэль паводзін. Таму з кожным наступным пакаленнем у нас усё больш інфантыльных мужчын.**

Без кахання я асабіста жыць не ўмею. Калі ў сям'і няма гэтага пачуцця, то ні дзіця, ні наяўнасць партнёра не ратуюць. Мы, жанчыны, проста абавязаны будаваць свае сем'і на аснове любові, веры, чысціні, дабрыні, самых светлых пачуццяў да сваіх мужчын. А далей трэба проста памятаць пра некаторыя асаблівасці выхавання нашых дзяцей. Калі мы выхоўваем хлопчыкаў, то, напэўна, нельга ўвесь час падстаўляць ім рукі, бо інакш вырастаюць цалкам інфантыльныя асобы, а не рашучыя прынцы, якіх мы ўсе чакаем.

### Памер мужчынскага шчасця

**Дзіяна БАЛЫКА:** Мужчыне сапраўды больш цяжка. Па-першае, існуе нейкая прэзумпцыя цішыні на размову пра «мужчынскае шчасце». Пытанне пра «жаночае шчасце» ўзнікла разам з рухам эмансіпацыі. Жанчыны ў апошнія 20 гадоў шмат дабіліся, каб па-рознаму канструяваць яго мазаіку. Бо, безумоўна, «шчасце» — паняцце агульначалавечае. І мужчыне, і жанчыне важныя і самарэалізацыя, і сям'я, і вандроўкі, і сувязі, і дабрабыт. Адзіная розніца ў тым, што ўдзельная вага гэтых кампанентаў у мужчыны і жанчыны сапраўды гендарна адрозніваюцца. Бо жанчына ў першую чаргу ўсё ж такі скіравана на мікракосмас сям'і. А мужчына — на макракосмас грамадства. Прымітыўна кажучы, пакуль жонка вырашае, на які даход ёй пракарміць дзяцей і мужа, муж заняты пераўладкаваннем свету. Але праблема мужчыны ў тым, што ён рэальна паўплываць на тое, што яго хвалюе, не можа.

І пакуль мужчына вызначаецца са сваёй місіяй, жанчыны напаўняюць турыстычныя аўтобусы, залы на псіхалагічных трэнінгах, у тэатрах і г.д... Усе сацыяльна актыўныя сферы жыцця належаць жанчыне. Тое, што мужчыны рухаюць прагрэс, нешта змяняюць — не больш чым вербальныя штампы.

З пункту погляду біялогіі, несумненна, мужчына — паляўнічы, ён павінен заваёўваць, утрымліваць, дасягаць... У яго павінна быць вялікае лібіда нават не ў плане жадання апладніць як мага больш самак, а ў плане экспансіі — экспансіі свайго інтэлекту, улады: зарабіць як мага больш грошай, заняць як мага больш высокую пасаду... Але праблема ў тым, што нашы мужчыны, яшчэ з заканчэння Другой сусветнай вайны, сталі выхоўвацца пераважна ў жаночых сем'ях, дзе ім маглі даць толькі жаночую мадэль паводзін. Таму з кожным наступным пакаленнем у нас усё больш інфантыльных мужчын. Яны не бачаць прыкладу паспяховых бацькоў і ім вельмі складана самім стварыць паспяховую мадэль паводзін.

**Рыта МІКУШАВА:** 80 працэнтаў маіх кліентаў — мужчыны, размаўляючы з якімі я даведалася, што яны вельмі хваравіта перажываюць разводы, адсутнасць магчымасці бачыцца з дзецьмі... Проста ім няма каму пра гэта сказаць. Іх не чуюць. Мужчыну робіць жанчына, якая побач... Менавіта яна натхняе яго ў тым ліку на клопат аб сабе самой... Жыццёвы вопыт паказвае: як жанчына ставіцца да мужчыны, так ён сябе і паводзіць.

Майму сыну 11 гадоў. Неяк я сказала яму, што мне хацелася б мець фарфоравую лялькү. Прыходжу аднойчы дадому, а сын кажа, што мяне чакае сюрпрыз. Аказалася, ён набыў мне гэтую ляльку! Калі я расказала знаёмым жанчынам, яны жахнуліся. Маўляў, хлопчык цацкі купляе. Але ж мой сын вучыцца рабіць падарункі! Гэта — якасць мужчыны.

### Навука быць шчаслівай

**Вераніка СЯРДЗЮК:** Гэта вельмі паказальны прыклад! Вашы знаёмыя, якія абурыліся вашым сынам, — класічны прыклад беларускай жанчыны. Наша жанчына не ўмее быць шчаслівай. Мужчына можа быць выхаваны правільна. Ён гатовы прынесці каву ў ложак, купіць кветкі, але ж... жанчына накінецца на яго: «Навошта ты патраціў грошы?» Беларуская жанчына не ўмее атрымліваць задавальненне ад жыцця. Больш за тое, перашкаджае гэта рабіць і свайму мужчыну, і нават сваім дзецям.

**Дзіяна БАЛЫКА:** Звярніце ўвагу, як будучае мацярынства гучыць на беларускай мове: «цяжарнасць»... У самой этымалогіі гэтага слова ёсць пэўная псіхалагічная нагрузка: гэта нейкія часовыя цяжкасці, цяжар для жанчыны. І паколькі мова сапраўды вельмі ўплывае на ўспрыманне свету, то для беларускіх жанчын стан будучага мацярынства — цяжар. Нашы жанчыны схільныя надаваць вельмі вялікую ўвагу таму, што яны выношваюць, нараджаюць дзіця і потым яго выхоўваюць. Нібыта гэта — подзвіг. Мой гінеколаг кажа, што страшэнна стаміўся ад цяжарных пацыентак, якія бясконца скардзяцца... Але мне выношванне дзіцяці дастаўляе толькі радасць! Не бачу ў гэтым ніякай цяжкасці. І гэта не залежыць ад стану здароўя. Гэта залежыць толькі ад псіхалагічнага настрою. Бо я бачыла шмат людзей з дыябетам, ракам, якія бясконца ўсміхаліся. І таксама бачыла людзей з грыпам, якія бясконца скардзіліся. Асабіста я здзіўляюся жанчынам, якія абураюцца на мужоў, што тыя п'юць шампанскае, калі яны народзяць. Але што можа зрабіць мужчына, якому не дадзена перажыць такое шчасце: унутры яго ніколі не будуць біцца два сэрцы, і ніхто яго не штурхне знутры ножкамі.

> **Ён гатовы прынесці каву ў ложак, купіць кветкі, але ж... жанчына накінецца на яго: «Навошта ты патраціў грошы?» Беларуская жанчына не ўмее атрымліваць задавальненне ад жыцця.**

**Вераніка СЯРДЗЮК:** Мы не навучымся быць па-сапраўднаму шчаслівымі, пакуль не навучымся аддаваць, прыносіць карысць, не чакаючы за гэта ўзнагароды... Прымаць, назапашваць таксама можна, але не гэта галоўнае. А вучыцца аддаваць, дарэчы, можна пачынаючы з уласных мужа і дзяцей. У царкоўнаславянскай мове ёсць выдатнае слова, якім называюць цяжарную жанчыну: «непраздная» — гэта значыць, занятая справай. І ад гэтай справы трэба атрымліваць задавальненне.

**Святлана ШЫЛАВА:** Трэба менш зацыклівацца на выпрабаваннях, без якіх не бывае ніводнае жыццё, і больш звяртаць увагу на той цуд, які таксама заўсёды адбываецца з намі. Я часта згадваю з'яўленне аднаго дзіўнага немаўляткі. Маці яго на той момант споўнілася 42 гады, 10 гадоў яна не магла зацяжараць і, нарэшце, зацяжарала, прычым без дапамогі рэпрадуктыўных тэхналогій. Можаце сабе ўявіць, як яна чакала гэтае дзіця! Нараджэнне адбывалася шляхам кесарава сячэння... Гэта вельмі складаная аперацыя, але мы толькі зрабілі разрэз, і я паднесла рукі, каб асцярожна вызваліць дзіця, як яно само выскачыла ў рукі... І такі баравічок! Вось што робіць матчына любоў!

**Рыта МІКУШАВА:** У жыцці здараецца шмат складаных сітуацый, але заўсёды ёсць выйсце... Асабіста для мяне маё жаночае жыццё — не цяжкае. Мне падабаецца тое, што я маю, і я вельмі люблю тое, чым займаюся. Мая задача як прафесіянала — захаваць унутраны баланс, не прыносіць негатыў з працы дадому. Стамляцца можна, але ў сям'і ўсе хочуць бачыць маму на варце сямейных інтарэсаў.

**Ірына НАРБЕКАВА:** Трэба пастаянна працаваць над сабой, над тым, каб быць больш добрымі, душэўнымі, менш зайздрослівымі. Нядаўна была на масажы... Хлопец-масажыст кажа, што яны з жонкай нармальна размяркоўваюць абавязкі, калі адзін гатуе, другі прыбірае... Або наадварот, па дамоўленасці. Разам з тым, сказаў, што ў Барысаве, калі нешта здарыцца з яго машынай, варта будзе толькі махнуць рукой, як нехта спыніцца і дапаможа, а ў Мінску не дачакаешся, каб прапусцілі выехаць са двара... Чалавечыя адносіны шмат што страцілі... Але ад нас, ад жанчын, залежыць, адраджэнне і захаванне лепшага.

**Дзіяна БАЛЫКА:** Аднак для выканання гэтай місіі пра жанчыну павінна паклапаціцца і... дзяржава. У нас шмат чаго робіцца, але, на маю думку, недастаткова падтрымліваюцца крэатыўныя самазанятыя слаі насельніцтва. Напрыклад, пісьменнік, які сам сябе ўладкоўвае на літаратурную працу за свой камп'ютар, атрымлівае аўтарскія ўзнагароджанні, працуе ўнутры прававога поля Беларусі, заключае дамоўленасці згодна з законам. Але ж па гэтых дамовах не адбываюцца выплаты ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва, і ён не атрымлівае грошы па бальнічным лісце, калі захварэе. А пісьменніца — па цяжарнасці. У Фондзе сацыяльнай абароны насельніцтва кажуць, што, каб атрымаць пэўныя выплаты, пісьменніку трэба ісці працаваць карэктарам ці рэдактарам у выдавецтва... Але ж калі ён ці яна сапраўдны пісьменнік, то навошта ахвяраваць сваім прызначэннем?

З аналагічнымі цяжкасцямі сутыкнуліся ў нашай краіне жанчыны — індывідуальныя прадпрымальнікі, рамеснікі, адвакаты і іншыя катэгорыі, на якія звычайна абапіраецца дзяржава ў іншых краінах...

Я — касмапаліт. Жыву адначасова ў Беларусі, Расіі і Латвіі. І перакананa: чалавек, калі ён шчаслівы па сутнасці, сам па сабе, будзе адчуваць сябе шчаслівым у любой краіне. Сваё дзіця я хачу нараджаць гэтым летам тут, у Мінску. Магчыма, яшчэ і таму, што мая сяброўка, кандыдат медыцынскіх навук, хоча прыняць у мяне роды...

**Святлана БАРЫСЕНКА:** *Ведаеце, гэта вельмі па-беларуску! І вельмі па-жаноцку!..*

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА:** *...І толькі з жанчынамі такое можа быць: нас тут размаўляе сямёра, а сэрцаў б'ецца... дзевяць!*

**Фота Надзеі БУЖАН.**

■ Пакаяннае...

# ЖАНЧЫНА БЫЛА СТВОРАНА РОЎНАЙ

**Міжнародны жаночы дзень. Якія асацыяцыі ён выклікае, акрамя вялізных чэргаў у крамах па розную непатрэбную драбязу і шырспажыў, а таксама заезджаных тостаў накшталт «за нашых цудоўных жанчын»?**

Адзін дзень з 365-ці ў годзе. Ці не замала? Ці не занадта рэдка мы, мужчыны, успамінаем, што побач з намі жывуць ЯНЫ? Не прыбіральшчыцы, не кухаркі, не выхавацелькі дзяцей (імёны якіх ты можаш і забыць, седзячы ў піўной), а менавіта жанчыны. Стварэнні клапатлівыя, ласкавыя, прыгожыя, якія завіхаюцца вакол нас штохвілінна, абы толькі дагадзіць, абы толькі родны, любы, каханы, блізкі чалавек быў шчаслівы. А мы чым плацім? Усяго на адзін дзень паблажліва прыкідваемся добрымі і паслужлівымі, дазваляем сабою трошкі пакамандаваць узамен на наш прыцягнуты за вушы камплімент? Можам нават расшчодрыцца і (о, гэта сапраўдная мужчынская веліч!) купіць для сваіх «жанчынак» па прывялым букецiку хрызантэм ці цюльпанаў. А ўвечары будзем старанна гаварыць тосты за жанчын і паднімаць кілішкі — адзін за адным. І так ад гэтага стомімся, што там жа, за сталом і ў гасцях, заснем... І жонка, з высока паднятаю галавою, з гонарам у вачах за свайго «героя», пацягне любае цела дадому...

Напэўна, павага да жанчыны праяўляецца не ў шанаванні свята, а ў штодзённым стаўленні да яе як да роўнай. У штодзённым клопаце аб ёй. За адзін дзень гэта не выхаваеш... Сёння ўсе ведаюць, што першапачаткова свята з'явілася як дзень салідарнасці працоўных жанчын у барацьбе за роўнасць правоў з мужчынамі. ААН дагэтуль святкуе яго як Міжнародны дзень барацьбы за правы жанчын і міжнародны мір. А вось мы, дзякуючы таму, што ў савецкія часы палітычны падтэкст свята быў нівеляваны, святкуем нешта дзіўнае, у паўсядзённым жыцці часцяком забываючы пра ўсе «ідэалы 8 сакавіка». Ходзім па вуліцах за руку з дзяўчатамі і лаемся матам, запіваючы яго півам. А дзяўчаты быццам не зважаюць на гэта, бо «і ў іншых так»...

«Калі б Бог прызначыў жанчыну быць валадаркай над мужчынам, ён стварыў бы яе з галавы, калі б — рабой, то стварыў бы з нагі; але паколькі ён прызначыў яе быць сяброўкай і роўнай мужчыне, то стварыў з рабра», — так пісаў Блажэнны Аўгустын, які, між іншым, жыў больш за паўтары тысячы гадоў таму. Столькі часу прайшло, а мужчыны так і не зразумелі гэтага...

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■ Выпрабавана на сабе

# ЯК Я БЫЎ... МАМАЙ,

## або Найноўшыя прыгоды Шурыка

**Напярэдадні чарговага Міжнароднага жаночага дня (я усе б гэтыя словы пісаў з вялікай літары) жанчынам традыцыйна гавораць кампліменты, гучаць тосты. Цытаваць ні першае, ні другое не буду, але раскажу, як нядаўна, дзякуючы падарунку лёсу, стаў на пару тыдняў... мамай, ды яшчэ і адзіночкай. Адзін даглядаў малых: старэйшаму зараз ужо 8, малодшаму 5.**

Адна справа — быць з дзецьмі, калі іх мама побач, а вось без яе — зусім іншае, для большасці мужчын нязвыклае. У што апранаць малых, чым штодня карміць? Дарослы можа яечню з'есці ці кансервы, і нічога, а малыя?

### І паклалі яе ў бальніцу...

Маці маіх дзяцей цяжка захварэла, і медыкі вырашылі, што без лячэння ў стацыянары не абысціся. «Я ў бальніцу, так што спраўляйцеся самі, — коратка сказала яна. — Калі што, тэлефануй!» (Помнік, дарэчы, трэба паставіць тым людзям, якія прыдумалі мабільную сувязь. І як мы раней жылі без мабільнікаў?). Інакш прыйшлося б штодня па некалькі разоў бегаць у бальніцу, па кансультацыю: як паводзіць сябе з дзецьмі, каб яны слухаліся.

Перад выхадам з дому Наташа пастаралася патлумачыць, дзе што ляжыць з дзіцячага адзення, абутку... Тут, напэўна, многія падумаюць: «добры» ж тата, калі такіх нюансаў не ведае!.. Вядома, трохі ведаю, але каб адразу разабрацца з калготкамі, майкамі, штанамі і іншым, калі ў адным трэба ў школу і садок хадзіць, у другім — на вуліцу, у трэцім — таксама на вуліцу, але «можна паваляцца ў снезе»... Толькі вы, жанчыны, ведаеце ўсе гэтыя нюансы.

Перспектыва «стаць мамай», ды яшчэ і адзінокай, адразу падалася няпростай, бо з-за занятасці на працы з дзецьмі бываю вельмі рэдка. А тут яшчэ так супала, што здароўе сыноў таксама пакідала жадаць лепшага. Такім чынам, давялося стаць паралельна яшчэ і медбратам.

### Кветак шмат, а я адзін!

Першы вечар прайшоў, як ні дзіўна, спакойна, я больш-менш памятаў, што назаўтра дзеці павінны апрануць і з'есці. А потым пачалося... Ну, не будзеш жа па кожнай дробязі тэлефанаваць сваёй «палове» ў бальніцу!

Дарэчы, вельмі выручыў цесць. (Цешча, на жаль, некалькі гадоў таму памерла.) Так што, на мой погляд, не маюць рацыю мужчыны, якія расказваюць анекдоты пра маці сваіх каханых: цешчы бываюць проста неабходнымі, прабачце за такі рацыянальны падыход!

Жонка, зразумела, перыядычна сама тэлефанавала. У першы раз пасварыліся па тэлефоне, калі папрасіла ў касметычцы знайсці нейкі інструмент, якім карыстаюцца толькі жанчыны. Была б памада, знайшоў бы адразу. А так... І паколькі я быў увесь у думках пра тое, што на дзяцей адзець, пошукі інструмента сярод іншых «аксесуараў» скончыліся кіданнем трубкі на тым баку сувязі.



> **Першы вечар прайшоў, як ні дзіўна, спакойна, я больш-менш памятаў, што назаўтра дзеці павінны апрануць і з'есці. А потым пачалося...**

Трэба было тэрмінова рэабілітавацца. Успомніў пра заданне паліць кветкі. Быццам бы, проста? Не! Бо адны трэба проста паліваць, а іншыя, якія стаяць «у талерцы», трэба «паіць», наліваючы ваду ў «падстаўку». Кветак шмат, я адзін.

Пры гэтым старэйшаму сыну нешта трэба, малодшаму таксама. Перыядычна яны нешта дзеляць, уступаюць у бойку і плачуць...

Прызнаюся, не раз успамінаў кадры з камедыі Гайдая. Памятаеце, калі Шурык паспрабаваў па просьбе гаспадыні жылля, бабулі, пасядзець з малой...

Таму самымі прыемнымі былі хвіліны, калі чытаў кніжку дзецям перад сном.

Вельмі цяжкім выпрабаваннем стала замена раствору для лінзаў жонкі. (У бальніцу яна ўзяла акуляры.) Хто ведае, што такое лінзы, зразумее, што да іх трэба ставіцца вельмі акуратна. Раствор трэба мяняць пастаянна. А, не дай Божа, упадзе лінза на падлогу! Наталля кансультавала мае дзеянні па тэлефоне. Як цяпер памятаю, патраціў хвілін 25, хаця вопытны чалавек і за пару хвілін справіўся б.

Потым у фірмовай краме ніяк не мог купіць паўфабрыкаты катлет, якія, на погляд Наталлі, былі патрэбны дзецям. Купіў у выніку замарожаныя, а патрэбны былі іншыя. І зноў па тэлефоне пачуў... крытыку. Ды я ўжо і раней такое чуў, так што крыўды не было.

Як рабіць хатнія заданні са старэйшым — пра гэта можна асобны артыкул напісаць...

### У камандзіроўку з дзецьмі?

Нікому нічога на працы не расказаў. Як мог выкручваўся, працаваў па вечарах і ўначы. І раптам вырашылі мяне тэрмінова адправіць у камандзіроўку.

Са старэйшым, Міхаілам, даводзілася ездзіць на абласныя «Дажынкі». Ну, гэта хаця б свята. Хоць браць інтэрв'ю, калі побач дзіця... Дарэчы, старшыня аблвыканкама нават руку малому паціснуў (для параўнання: нам, журналістам — не). Мішу мы адразу пачалі паважаць!

Жарт жартам, а як ехаць, калі мама ў бальніцы, а дзецям трэба ў сад і школу, а потым сустракаць іх, карміць... «Паехаў»... не выходзячы з дому: добры чалавек сам прапанаваў мне сустрэчу праз інтэрнэт!

❑❑❑

Пасля таго, як некалькі дзён правёў з дзецьмі, апошнія сталі лепш да мяне ставіцца. Адчулі, што мы «ў адной камандзе», што трэба сябраваць.

А я вось што зразумеў (хоць і раней здагадваўся): быць Жанчынай — гэта дар нябёсаў.

Цікава толькі, як вам удаецца сачыць за сабой, каб выглядаць заўсёды прывабна?..

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■ Нежаночая справа?

# А ЁЙ ЛЯТАЦЬ АХВОТА...



**Гераіня гэтай публікацыі сустрэла мяне на парозе сваёй кватэры. Каля дзвярэй я ўбачыла невысокую русавалосую жанчыну, якая за ручку трымала маленькага сына. На сценах у пярэднім пакоі — фотаздымкі шчаслівай пары, а ўвогуле інтэр'ер ніяк не выдае таго, хто тут жыве. Хаця я не здзівілася б прысутнасці авіяцыйнай сімволікі ў кватэры, бо мая суразмоўца Наталля Малашанка з'яўляецца адзінай у Беларусі жанчынай — ваенным пілотам!**

Пра тое, з чаго пачаўся яе раман з небам, Наташа распавядае сцісла і проста:

— Мне было пятнаццаць. Убачыла аб'яву пра заняткі ў ДТСААФе і вырашыла запісацца. Спачатку нам выкладалі тэорыю, расказвалі пра планёры, палёты. Потым пачалася парашутная падрыхтоўка. Але толькі калі села за штурвал самалёта, зразумела, што знайшла сваё месца.

...Наташа вырасла ў звычайнай бабруйскай сям'і: маці працуе ў краме, а тата займаецца грузаперавозкамі. Да ваеннай справы мае дачыненне толькі стрыечны дзед. Былы лётчык, ён абараняў інтарэсы Наташы, калі маці запрацівілася небяспечнаму, на яе погляд, захапленню дачкі. Сказаў сваёй пляменніцы: «Чаго ты непакоішся? Няхай займаецца, усё ж пры нейкай справе, а калі паспрабуе палятаць, спужаецца і сама закіне». Не закінула.

— Але ў мяне не было ніякага страху, хутчэй, проста хваляванне. Затое пасля першага палёту — такія эмоцыі, словамі не апісаць!

Хутка бацькі зразумелі, што звычайнае хобі стала нечым большым, і перасталі пярэчыць. Тым больш спраўляцца з валявым характарам дачкі заўсёды было няпроста. У сям'і хацелі, каб Наташа стала перакладчыкам, а яна вырашыла паступаць у БНТУ на менеджмент.

— Заўсёды лічыла, што веданне моў — выдатны бонус, а прафесія павінна быць грунтоўнай. Я і ў школе больш любіла прадметы, якія звычайна выбіраюць хлопцы. Падабалася фізіка...

У Мінску другім домам для Наталлі стаў аэраклуб «Баравая», дзе дзяўчына працягвала займацца любімай справай. А праз два гады дырэктар аэраклуба паведаміў, што ў Ваенную акадэмію ўпершыню набіраюць дзяўчат на лётную спецыяльнасць. Наташа доўга не разважала, перавяла дакументы і была залічана адразу на трэці курс. Адзіная з паўсотні абітурыентак! Але мая суразмоўца кажа, што ніколі не адчувала сваёй выключнасці. Ды і ў акадэміі студэнтаў рэдка хвалілі. Напэўна, знарок, каб не задзіралі насы.

— Насамрэч, па ўсім свеце шмат дзяўчат служаць у ваеннай авіяцыі — у ЗША, Францыі, Ізраілі, ёсць лётчыцы ў суседніх Расіі і Украіне. Вось і ў нас дзяўчаты сталі падцягвацца. Наколькі я ведаю, раней сярод беларусак проста не было попыту на ваенныя спецыяльнасці. З'явіўся попыт — сталі пашыраць набор. Зараз, напрыклад, толькі на авіяцыйным факультэце Ваеннай акадэміі навучаецца каля дзясятка дзяўчат. Большасць з іх на інжынерных спецыяльнасцях, але ёсць адна, якая асвойвае верталёты.

Сама Наталля з лёгкай настальгіяй успамінае гады, праведзеныя ў Ваеннай акадэміі.

— Спачатку было складана. Я — сава, а тут трэба было рана прачынацца. Ды і фізічная падрыхтоўка давалася цяжка. А тое, што з гэтага часу кантраляваўся кожны мой крок, — асобная гісторыя. Магчыма, часам і хацелася запратэставаць, але хто ж будзе слухаць?! Распарадак ёсць распарадак. Да дзяўчат у акадэміі ставіліся па-рознаму. Некаторыя прымалі, як звычайнага ваеннага студэнта, а некаторыя, галоўным чынам аднакурснікі, выказвалі пагардлівасць. Даводзілася чуць штосьці накшталт: «Вам, дзяўчатам, проста так добрыя адзнакі ставяць, многае даруюць...». Часам было цяжка адной у мужчынскім калектыве. Не хапала сяброўкі побач. Добра, што хоць у інтэрнаце жыла з дзяўчатамі з іншых факультэтаў.

Восенню і зімой студэнты авіяцыйнага факультэта вучыліся ў сценах акадэміі, а з мая па верасень выязджалі на практычныя заняткі. На адным з такіх практычных заняткаў Наталля ўпершыню села за штурвал ваеннага самалёта.

**Спачатку муж спрабаваў угаварыць мяне забыць пра ваенную кар'еру ці хацця б дасядзець увесь водпуск па доглядзе дзіцяці. Але потым зразумеў, што я літаральна жыву і чакаю, каб зноў вярнуцца ў неба, і спыніў гэтыя спробы.**

— Адразу адчула нейкую грунтоўнасць і нават гонар. Грандыёзная моц, неверагодная хуткасць, а якая манеўранасць! Безумоўна, кіраваць такім самалётам складаней, чым звычайным планёрам. Але я спраўлялася. За ўвесь час навучання ні разу не адчула праблем у небе. Заўсёды старалася адказна выконваць заданні. Бо нас сур'ёзна адчытвалі за самае нязначнае самавольства. Перавысіш хуткасць ці перагрузку — прыбор пакажа, і атрымаеш вымову. Часам у кабіне побач сядзеў інструктар, падказваў, накіроўваў, дапамагаў. Гэта ўжо калі скончыла акадэмію і атрымала размеркаванне на авіяцыйную базу ў Мачулішчы, канчаткова зразумела, што больш разлічваць няма на каго, толькі на сябе.

Але на новым месцы давялося папрацаваць толькі паўтара месяца. Незадоўга да заканчэння акадэміі Наталля выйшла замуж і рыхтавалася стаць маці. Зараз сыну Мікіту ўжо год. Наташа кажа, што хлапчук падобны да яе таты.

— Такі ўжо гарэза! Не перастаю дзівіцца, колькі ў ім энергіі. Цэлы дзень гатовы гуляць, важдацца з цацкамі, паспаць удзень — не прымусіць. Зусім нядаўна навучыўся хадзіць. Вы б бачылі, як я рэагавала на першы крок сына! Гэта як сцэна з кінафільма ці рэкламы — малы ў памперсах і шчаслівая маці з усмешкай ва ўвесь рот. Увогуле Мікіта вельмі хутка ўсяму вучыцца. Літаральна на днях убачыла, як ён вілку ад пыласоса ўстаўляў у разетку. Кожнаму такому адкрыццю радуешся, як чамусьці незвычайнаму.

Жанчына кажа, што нараджэнне сына кардынальна яе змяніла.

— Перш за ўсё з'явілася каласальная адказнасць. З аднаго боку нерэальнае шчасце разумець, што я дала жыццё новаму чалавеку, а з іншага — часам бывае нават страшна ад асэнсавання неверагоднай адказнасці за сваё дзіця. Ды і ўвогуле ўсё жыццё змянілася — ад глабальных момантаў да нейкіх дробязяў. Цяпер, напрыклад, калі іду па магазінах, гляджу, што б такога карыснага можна было набыць для сына, а не для сябе. Неяк у інтэрнэце прачытала вершык такога зместу: маці пайшла ў краму, каб купіць сабе сукенку, туфлі, сумку, а вярнулася з шабляй, мячыкам і машынкай... таму што ў яе ёсць любімы хлопчык. Гэта гісторыя — пра мяне.

Бабулі-дзядулі маленькага Мікіты жывуць у іншых гарадах, таму гадаваннем сына займаюцца выключна Наташа і яе муж, памагатых няма. У верасні хлопчыка можна ўжо будзе аддаць у дзіцячы садок. Тады Наталля плануе зноў сесці за штурвал.

— Спачатку муж спрабаваў угаварыць мяне забыць пра ваенную кар'еру ці хацця б дасядзець увесь водпуск па доглядзе дзіцяці. Але потым зразумеў, што я літаральна жыву і чакаю, каб зноў вярнуцца ў неба, і спыніў гэтыя спробы. Да сварак справа не даходзіла. Ведаеце, некаторым здаецца, што саюз дваіх ваенных — гэта абавязкова сутычкі, скандалы, высвятленні адносін. У нас усё не так. Безумоўна, як у любой іншай маладой сям'і, здараюцца канфліктныя сітуацыі, але праблемы мы вырашаем ціха і мірна.

Наталля кажа, што гатова спалучаць кар'еру лётчыка і нялёгкую ролю маці і жонкі.

— У такіх выпадках я заўсёды кажу: той, хто хоча, шукае шляхі, а той, хто не хоча — адгаворкі. Не хачу ахвяраваць любімай справай дзеля сям'і і наадварот, таму буду шукаць выйсце, каб атрымаць і адно, і другое.

Неяк, калі я была яшчэ цяжарная, мы з мужам хадзілі на кніжную выставу. І адна прадаўшчыца запыталася, каго мы чакаем. Адказалі разам, але па-рознаму. Я сказала «сына», а муж — «дачку». Так што будзем яшчэ думаць пра сястрычку для Мікіты. А потым я зноў вярнуся ў неба, можаце не сумнявацца.

Я і не сумняваюся! Пілот у небе, жонка і маці дома, Наталля, напэўна, яшчэ не раз дасць падставу ўспамінаць пра яе. Бо чалавек, які з такім запалам і хваляваннем распавядае пра сваю любімую справу, не можа не стрымаць абяцанне.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ**

# ВЯСНА ПРЫХОДЗІЦЬ З КВЕТКАМІ!

**«Танцуючая каралева» і «Мілва», «Аква» і «Карыбія» — каля трыццаці сартоў чырвоных, жоўтых, белых ружаў вырошчваюць у цяпліцах мінскага прадпрыемства «Кветкі сталіцы». Трапляем у сапраўдны райскі куток: прыгожа, навокал — густы кветкавы водар...**

**У кветкаводаў зараз самая гарачая пара — ружы хоць і вырошчваюцца тут круглы год, попыт перад вясеннімі святамі значна павялічваецца. І менавіта ружа традыцыйна стала каралевай сакавіцкага свята.**

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**





Даты | Падзеі | Людзі

**1918** год — 95 гадоў назад нарадзіўся (вёска Чарэя Чашніцкага раёна) Яўген Піліпавіч Іваноўскі, генерал арміі (1972), Герой Савецкага Саюза (1985). У гады Вялікай Айчыннай вайны з 1941 года — на Заходнім, Сталінградскім, Варонежскім, 1-м і 2-м Беларускіх франтах. Удзельнік баёў пад Масквой, Сталінградам, Курскам, вызвалення Украіны, Польшчы, Усходне-Прускай аперацыі. У 1945-1956 гадах на адказных пасадах у Савецкай Арміі. З 1980 года — камандуючы войскамі БВА, з 1985-га — галоўнакамандуючы сухапутнымі войскамі — намеснік міністра абароны СССР, з 1989 года ваенны інспектар-саветнік. Памёр у 1991 годзе.



**1933** год — у такі ж дзень 1933 года (а ў ЗША гэта быў час эканамічнага і фінансавага крызісу) інжынер Чарльз Дароу, які страціў работу і зарабляў на жыццё, выгульваючы сабак сваіх суседзяў, каб абстрагавацца ад змрочных думак і хоць бы на вечар уявіць сябе паспяховым бізнэсменам, прыдумаў гульню «Манаполія». Скончыўшы выразаць дамы і гатэлі з кавалачкаў дрэва, а фішкі — з бранзалета жонкі, ён прапанаваў «Манаполію» вядучым вытворцам гульняў у Амерыцы — братам Паркерам. Але тыя, палічыўшы гульню занадта складанай, спачатку ад яе адмовіліся. Толькі амаль праз два гады — да Раства 1935 года — браты ўсё ж рызыкнулі і выпусцілі «Манаполію» велізарным тыражом. І ўсю Амерыку, а затым і ўвесь свет захліснула манаполіманія, а Чарльз Дароу стаў мільянерам.

**1938** год — нарадзіўся (вёска Круці Мядзельскага раёна) Міхаіл Міхайлавіч Чарняўскі, беларускі археолаг, пісьменнік, кандыдат гістарычных навук. Аўтар навуковых, навукова-папулярных і празаічных твораў. Адзін з аўтараў кніг «Нарысы па археалогіі Беларусі» (ч.1), «Археалогія Беларусі» (т.1), «Гісторыя Беларусі» (т.1) і іншых. Памёр у 2013 годзе.

Было сказана

**Анатоль ГРАЧАНІКАЎ (1938-1991), паэт і перакладчык:**

*«Жанчыны ўмеюць чакаць,*
*Жанчыны ўмеюць кахаць,*
*Многае ўмеюць жанчыны.*
*Пяшчотны іх шчэбет птушыны,*
*Што чуць пашчасціла мне,*
*І вас няхай не міне».*

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Электраакустыка. Ідыёма. Сабза. Астра. Бег. Ровар. Ружа. Антураж. Ава. Адказ. Мана. Анкара. Бал. Ракада. Гуру. Руб. Туя. Талон. Адрас. Ніт. Карп. Пашана. Нарыс. Пуга. Алах. Півоня. Артыкль.

**Па вертыкалі:** Калевала. Гладыёлус. «Артэк». Абутак. Тарэра. Уса. Таіс. Алея. Саржа. Прапан. Ажына. Руля. Бівак. Крыга. Камуз. Саха. Абраз. Тып. Хала. Грам. Абарона. Ажан. Дунін. Араб. Таймень.

**У сувязі са святам наступны нумар «Звязды» выйдзе ў аўторак, 12 сакавіка.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.44 | 18.58 | 11.14 |
| Віцебск — | 7.35 | 18.47 | 11.12 |
| Магілёў — | 7.34 | 18.48 | 11.14 |
| Гомель — | 7.29 | 18.46 | 11.17 |
| Гродна — | 7.59 | 19.14 | 11.15 |
| Брэст — | 7.58 | 19.16 | 11.18 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 4 сакавіка. Месяц у сузор'і Казярога.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Ірыны, Апанаса, Віктара, Івана, Іосіфа, Леаніда, Міхаіла, Пятра, Уладзіміра, Фёдара.*
***К.*** *Пярпетуі, Феліцыты, Паўла, Тамаша.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Як 23 Лютага павіншуеш, так 8 Сакавіка і правядзеш! — сказаў муж.

— Як 8 Сакавіка павіншуеш, так увесь год і правядзеш! — адказала жонка.

**8 Сакавіка: нецвярозыя бабы, перапэцканыя шакаладам, шпацыруюць па вуліцах, б'юць сабе аб галовы флаконы з духамі і чапляюцца да спалоханых мінакоў з пытаннем «А ты нараджаў?!»**

— Мужыкі, што жанчынам будзем дарыць на 8 Сакавіка?

— Надзенем шкарпэткі, намажамся крэмам — і будзе ім стрыптыз!



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 61, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 25.471. Індэкс 63850. Зак. № 1140.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 6 сакавіка 2013 года.